NACIONALINĖ
ŠVIETIMO
AGENTŪRA

______________________________________________________________

(miestas / rajonas, mokykla)

______ klasės mokinio (-ės) ____________________________________________

(vardas ir pavardė)

# GIMTOJI KALBA (BALTARUSIŲ)
# РОДНАЯ МОВА (БЕЛАРУСКАЯ)

Mokyklinio brandos egzamino užduotis
Pagrindinė sesija

Trukmė – 4 val. 15 min. (255 min.)

NURODYMAI

- Pasitikrinkite, ar egzamino užduočių sąsiuvinyje nėra tuščių lapų arba kito aiškiai matomo spausdinimo broko. Pastebėję praneškite egzamino vykdytojui.
- Užrašykite savo miestą / rajoną, mokyklą, klasę, vardą ir pavardę tam skirtoje užduoties sąsiuvinio vietoje.
- Rašykite aiškiai, įskaitomai juodai rašančiu tušinuku. Koregavimo priemonėmis naudotis negalima. Neaiškiai parašyti, pribraukyti, už ribų parašyti atsakymai vertinami 0 taškų.
- Atlikdami teksto suvokimo užduotis (II egzamino dalis), į klausimus atsakykite glaustai ir aiškiai. Jūsų atsakymai turi tilpti paliktose eilutėse.
- III egzamino dalyje pateiktos trys rašinio temos ir du tekstai interpretacijai. Įdėmiai juos perskaitykite, pasirinkite ir parašykite vieną rašinį arba vieną teksto interpretaciją.
- Turite parašyti 250–400 žodžių (A4 formato 1,5–2 psl.) tekstą. Vertinant bus atsižvelgiama ir į darbo apimtį. Švarraštyje suskaičiuokite žodžius. Paraštėje **pažymėkite 250 žodžių ribą**.
- Jeigu pirmiausia rašote juodraštyje, pasilikite pakankamai laiko darbui perrašyti į švarraštį. **Juodraštis nebus tikrinamas ir vertinamas.**

Linkime sėkmės!

VERTINIMAS

| **II dalis (teksto suvokimas)** | **III dalis (teksto kūrimas)** | **TAŠKŲ SUMA** |
|---|---|---|
| 30 taškų | 40 taškų | 70 taškų |
| | | |

Vertinimo komisija: ______________________________

(parašas, vardas ir pavardė)

______________________________

(parašas, vardas ir pavardė)

______________________________

(parašas, vardas ir pavardė)

© Nacionalinė švietimo agentūra

II egzamino dalis

# TEKSTO SUVOKIMAS

*Прачытайце тэкст і выканайце змешчаныя пасля яго заданні.*

**I** Кожная цывілізаваная краіна мае майстроў слова. Яны не толькі дораць ёй шырокую вядомасць, але і паказваюць у сваіх творах характар роднага народа, яго гістарычны лёс.

**II** Наша родная Беларусь таксама мела і мае летапісцаў і прарокаў. Хто такія Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Максім Гарэцкі, Алесь Гарун, Кузьма Чорны? Толькі паэты і празаікі? Не, гэта яшчэ і ўніклівыя празарліўцы, і самаадданыя абаронцы інтарэсаў роднага краю.

**III** Сярод майстроў слова па праву заняў пачэснае месца і Васіль Быкаў, пісьменнік з сусветным прызнаннем. Што забяспечыла яму абсалютны аўтарытэт і ўстойлівы давер не толькі інтэлектуалаў з далёкіх і блізкіх дзяржаў, але і мільёнаў чытачоў усіх кантынентаў?

**IV** Перш за ўсё, безумоўна, выключны талент, той “божы дар”, які даецца нячаста і здольны ператрываць усё. Васіль Быкаў не адкідаў пагардліва традыцыі класікаў. Ён ашаламляў сваіх прыхільнікаў праўдаю і глыбінёй спасціжэння паводзін чалавека ў так званых экстрэмальных абставінах. Яго героі – радавыя салдаты. Яны зусім звычайныя людзі. Сітуацыя на мяжы жыцця і смерці вымушала іх рабіць выбар на карысць дабра ці зла. Кожны з гэтых людзей, такі падобны да іншых у будзённых умовах, раптам раскрываецца для нас нечакана і непаўторна. Васіль Быкаў бязлітасна праўздзіва выпісвае чалавека: у праяўленні то дабрыні, працавітасці, мужнасці, а то і пакорлівасці ды хістання.

**V** Пісьменнік ваеннай тэмы, Васіль Быкаў сам прайшоў і прапоўз горкае поле вайны пад грукат снарадаў і лязг танкаў, удосталь наглытаўся парахавога дыму і горкіх слёз, пахаваў многіх сяброў і загаіў не адну рану. Ён мае і асабістае, асаблівае права “судзіць” вайну і смела спавядацца перад чыстай памяццю загінуўшых. Можа, адсюль той стрыманы, схаваны недзе ў дальніх куточках свядомасці крык у абарону чалавечнасці і жыцця, які чуецца амаль на кожнай старонцы быкаўскай прозы.

**VI** Гэта вялікае шчасце – жыць у адным часе, на адной зямлі з такімі асобамі, з такімі выдатнымі майстрамі! Ёсць каму верыць, ёсць кім захапляцца.

Паводле Г. Бураўкіна

*Заданні да тэксту*

| | Балы I | II | III |
|---|---|---|---|

**1.** Вызначце стыль тэксту.

______________________________________________

*(1 бал)*

**2.** З прыведзеных ніжэй асаблівасцей стыляў літаратурнай мовы выберыце тыя, якія ўласцівы гэтаму стылю.

**А** – эмацыянальнасць
**Б** – шмат тэрмінаў
**В** – ацэначная лексіка
**Г** – клічныя, пытальныя сказы
**Д** – дакладнасць
**Е** – слэнг
**Ж** – моўныя штампы

*(3 балы)*

**3.** Кожную з гэтых асаблівасцей праілюструйце адным прыкладам з тэксту.

______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________

*(3 балы)*

**4.** Абапіраючыся на змест І-га абзаца, вызначце ролю мастацкай літаратуры ў нацыянальнай культуры:

1) ____________________________________________
2) ____________________________________________
3) ____________________________________________

*(1,5 бала)*

**5.** Пісьменнікі ствараюць мастацкія творы. Але Г. Бураўкін выдзяляе яшчэ адну важную іх ролю ў грамадстве. Якую? Адкажыце словамі тэксту.

______________________________________________
______________________________________________

*(1 бал)*

| Сума балаў за заданні 1–5 *(макс. 9,5 бала)* | | | |
|---|---|---|---|

| | *Балы* | |
|---|---|---|
| *I* | *II* | *III* |

**6.** Чаму Г. Бураўкін называе беларускіх пісьменнікаў-класікаў “летапісцамі і прарокамі”?

___

___

___

*(2 балы)*

**7.** Прадоўжыце рад імёнаў, пералічаных аўтарам артыкула ў II абзацы, трыма прозвішчамі беларускіх пісьменнікаў, вартых звання “майстар слова”.

___

___

*(1,5 бала)*

**8.** Ці любога аўтара мастацкага твора можна назваць “майстрам слова”? Аргументуйце свой адказ.

___

___

___

*(2 балы)*

**9.1.** Васіль Быкаў не адкідаў традыцыі класікаў. А назавіце пісьменніцкія арганізацыі XX ст., члены якіх адмаўляліся ад створанай да іх мастацкай літаратуры.

___

*(1 бал)*

**9.2.** Мастацкім крэда якой з гэтых арганізацый былі словы *У рожкі са старымі*?

___

*(1 бал)*

**10.** Назавіце галоўную тэму твораў В. Быкава.

___

*(1 бал)*

**11.** Якія асаблівасці пабудовы сюжэтаў твораў В. Быкава вылучае аўтар артыкула?

___

___

___

___

*(2 балы)*

| Сума балаў за заданні 6–11 *(макс. 10,5 бала)* | | | |
|---|---|---|---|

| | *Балы* I | II | III |
|---|---|---|---|
| **12.** Абапіраючыся на тэкст, адкажыце, у чым праяўляецца псіхалагізм твораў В. Быкава.<br><br>____________________________________________<br>____________________________________________<br>____________________________________________<br>*(2 балы)* | __ | __ | __ |
| **13.** Пералічыце, што, на думку Г. Бураўкіна, забяспечыла В. Быкаву сусветнае прызнанне.<br>1) ________________________________________<br>2) ________________________________________<br>3) ________________________________________<br>4) ________________________________________<br>*(2 балы)* | __ | __ | __ |
| **14.1.** З ІІ-га абзаца выпішыце два словы-сінонімы.<br>____________________________________________<br>*(1 бал)* | __ | __ | __ |
| **14.2.** З ІV-га абзаца выпішыце сінонім да слова *талент*.<br>____________________________________________<br>*(1 бал)* | __ | __ | __ |
| **15.** Запішыце тры азначэнні да слова *давер*.<br>____________________________________________<br>____________________________________________<br>*(1,5 бала)* | __ | __ | __ |
| **16.** Выпішыце з тэксту пяць запазычаных слоў.<br>____________________________________________<br>____________________________________________<br>*(2,5 бала)* | __ | __ | __ |
| Сума балаў за заданні 12–16 *(макс. 10 балаў)* | | | |

## АЦЭНКА ВЫКАНАННЯ ТЭСТА

| | Макс. сума | Члены камісіі | | |
|---|---|---|---|---|
| | | I | II | III |
| Сума балаў за заданні 1–5 | 9,5 | | | |
| Сума балаў за заданні 6–11 | 10,5 | | | |
| Сума балаў за заданні 12–16 | 10 | | | |
| **Сума балаў** | 30 | | | |
| **Акругленая сума балаў** | 30 | | | |

III egzamino dalis

# TEKSTO KŪRIMAS

*З прапанаваных трох тэм сачыненняў і двух тэкстаў для інтэрпрэтацыі Вы павінны выбраць адну тэму альбо адзін тэкст і напісаць працу.*

*Ваша праца павінна быць аб'ёмам 250–400 слоў (1–2 старонкі фармата А4). У чыставіку ад пачатку працы адлічыце 250 слоў, пазначце месца, дзе яны заканчваюцца, і запішыце гэтую колькасць на палях.*

## ТЭМЫ САЧЫНЕННЯЎ

**1.** Кніга, якую будуць чытаць заўсёды. Якая яна?

**2.** Што дапамагае чалавеку ўзвысіцца над смерцю? (Па творах В. Быкава)

**3.** Праблема “бацькі і дзеці” ў беларускай літаратуры.

## ТЭКСТЫ ДЛЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫІ

**4.** Максім Танк

Ты яшчэ толькі намёк на чалавека,
Калі ва ўсім спадзяешся на маці;

Ты яшчэ – чвэрць чалавека,
Калі ва ўсім спадзяешся на дружбу;

Ты толькі – паўчалавека,
Калі ва ўсім спадзяешся на любоў, –

І толькі тады становішся чалавекам,
Калі ўсе могуць спадзявацца
На цябе.

1981

**5.** Васіль Зуёнак

Рабіна –
Восені рыбіна
Чырванапёрая –
Трапеча ў імглістай стыні.
Рабыня
Вятроў –
Ты сталася мне апораю
У мітуслівай людской пустыні...
Густыя –
Луской

Шапатлівай –
Лісты а-
па-
да-
юць,
Як дні залатыя,
Мае незваротныя.
З табою
Абое шукаем сустрэч нешчаслівых,
Абое – сыходзімся, як маладыя, –
Абое – смяротныя...
З табой мы
Горкай часінаю,
Блуднай, знявечанай,
Ратуемся разам ад ліха:
Ты боль мой
Спагадай рабінавай,
Я твой – чалавечаю
Ціха
Вылечваю...

## ЧАРНАВІК

*Працяг чарнавіка на 10-й старонцы*

## ЧЫСТАВІК

*I II III*

***Працяг чыставіка на 11-й старонцы***

***Працяг чарнавіка***

***Працяг чыставіка***

*I* *II* *III*

***Працяг чыставіка на 12-й старонцы***

***Працяг чыставіка***

*I II III*

| III частка (сачыненне) | | | | Сума балаў |
|---|---|---|---|---|
| Змест | Структура тэксту | Стыль мовы | Граматнасць | |
| 20 балаў | 4 балы | 4 балы | 12 балаў | 40 балаў |
| | | | | |